# УКРАІНСКАЯ ПЕРЫЁДЫКА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ДЫСКУРСЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1905–1914)

**У. Д. Русецкая**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, vladislavaruseckaa12@mail.ru*

Артыкул прысвечаны развіццю перыядычнага друку з украінскім нацыянальным ухілам у перыяд 1905–1914 гг. Аўтар разглядае выдавецкую дзейнасць як значную частку нацыянальнага жыцця Украіны і найбольш паспяховую сферу ўкраінскага руху паслярэвалюцыйнай эпохі. Даецца агульная характарыстыка асноўных газет і часопісаў Наддняпраншчыны, іх матэрыяльны стан і ўзровень папулярнасці. У працы аналізуецца праблема рэнтабельнасці ўкраінскіх выданняў і урадавых абмежаванняў. Тым не меньш, вынікі выдавецкай дзейнасці былі пазітыўнымі ў кантэксце ўздыму грамадска-палітычнага дыскурсу ў Расійскай імперыі, у тым ліку па нацыянальнаму пытанню.

***Ключавыя словы:*** выдавецтва; друк; нацыянальны дыскурс; нацыянальны рух; перыёдыка.

# УКРАИНСКАЯ ПЕРИОДИКА В НАЦИОНАЛЬНОМ ДИСКУРСЕ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (1905–1914)

**В. Д. Русецкая**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, vladislavaruseckaa12@mail.ru*

Статья посвящена развитию периодической печати с украинским национальным уклоном в период 1905–1914 гг. Автор рассматривает издательскую деятельность как значимую часть национальной жизни Украины и наиболее успешную сферу украинского движения послереволюционной эпохи. Дается общая характеристика основных газет и журналов Надднепрянщины, их материальное состояние и уровень популярности. В работе анализируется проблема рентабельности украинских изданий и правительственных ограничений. Тем не менее, результаты издательской деятельности были позитивными в контексте подъема общественно-политического дискурса в Российской империи, в том числе по национальному вопросу.

***Ключевые слова:*** издательство; печать; национальный дискурс; национальное движение; периодика.

# UKRAINIAN PERIODICALS IN THE NATIONAL DISCOURSE OF THE RUSSIAN EMPIRE (1905–1914)

**V. D. Rusetskaya**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, vladislavaruseckaa12@mail.ru*

The article is devoted to the development of periodicals with a Ukrainian national bias in the period 1905–1914. The author considers publishing as a significant part of the national

life of Ukraine and the most successful sphere of the Ukrainian movement of the post-revolutionary era. The general characteristics of the main newspapers and magazines of the Naddnepranschyna, their material condition and the level of popularity are given. The paper analyzes the problem of profitability of Ukrainian publications and the nature of government restrictions. Nevertheless, the results of publishing activities were positive in the context of the rise of socio-political discourse in the Russian Empire, including on the national issue.

***Keywords:*** publishing house; printing; national discourse; national movement; periodicals.

На рубяжы XIX–XX стст. украінская справа перажывала трансфармацыю ў бок палітызацыі і набыцця масавасці. Развіццё нацыянальных рухаў у Расійскай імперыі і за мяжою, рост нацыянальнай самасвядомасці, уключэнне ўсё большай колькасці насельніцтва ў грамадска-палітычнае жыццё і, нарэшце, выбух першай рускай рэвалюцыі ўзнялі нацыянальны дыскурс у Расіі на новы якасны ўзровень, паставіўшы на павестку дня з новай выразнасцю нацыянальнае пытанне. Уздым нацыянальных рухаў адбываўся не толькі ў плоскасці палітычнай барацьбы, але і ў суперніцтве за фарматаванне нацыянальнай ідэнтычнасці шматмільённага насельніцтва. На маларускіх землях у найбольш жорсткі этап супрацьстаяння ўступілі рускі і ўкраінскі нацыяналізмы.

Выразнай адметнасцю дынамікі нацыянальных рухаў у гады рэвалюцыі 1905–1907 гг. і пасля яе стала энэргічнае ўзнікненне і развіццё перыядычных выданняў на нацыянальных мовах, што стала магчымым пасля прыняцця адпаведнага заканадаўства[1]. Комплекснага даследавання гэтага напрамку дзейнасці нацыянальных эліт ускраін імперыі не з’явілася, таму дадзены артыкул мае сваёй мэтаю пастаноўку асноўных акцэнтаў у асмысленні характару, асаблівасцяў і стану ўкраінскага перыядычнага друку, а таксама яго ролі ў здейсненні нацыянальнай справы.

Украінскі нацыянальны рух на пачатку XX ст. засяродзіў сваі асноўныя патугі на двух аспектах: культурнага (перш за ўсё, моўнага) і палітычнага развіцця. Да першага адносілася прызнанне правоў самастойнай украінскай мовы, уключэнне яе ў розныя сферы грамадскага ўжывання, стварэнне сістэмы народнай асветы на нацыянальнай глебе і г. д. У палітычным спектры ўкраінцы на чале з праф. М. Грушэўскім выступалі за федэралізацыю Расійскай імперыі і ўвядзенне нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі. У той час, як падаўленне рэвалюцыі, сталыпінская рэакцыя, слабасць украінскага палітычнага руху, расчараванне вынікамі пастаноўкі ўкраінскага пытання ў Дзяржаўнай Думе прывялі да пэўнага прыглушэння палітыка-партыйнай актыўнасці, цэнтр нацыянальных намаганняў змясціўся ў бок легальнай грамадскай дзейнасці, здзяйсненне якой давала магчымасці выдаўніцкая праца.

[1] Указ Мікалая II «О временных правилах о повременных изданиях» ад 24.11.1905 г.

Моцны ўздым колькасці ўкраінскіх выданняў назіраўся падчас 1905–1907 гг., калі ўзнікла каля паловы ўсіх часопісаў і газет, якія выходзілі да 1917 г. [1, с. 27]. Большасць з іх не перажылі рэвалюцыйнай эпохі і пасля-рэвалюцыйнай рэакцыі, значная частка выходзіла толькі некалькімі нумарамі. Аднак украінская нацыянальная эліта падхапіла запал выдавецкай дзейнасці і ў наступныя гады прыкладала шмат высілкаў для падтрымання перыядычнага друку.

Найбольш знакавымі выданнямі ўкраінскага друку з'яўляліся «Рада», якая выходзіла з 1906 па 1914 гг. і была адзінаю штодзённай газетай да вайны, «Сяло» і «Засеў» — сялянскія штотыжнікі (другі выдаваўся замест першага пасля яго прыпынення), якія мелі найбольшы поспех па колькасці перадплатнікаў, «Украінскі веснік» (1906), у якім выразна адлюстравалася ўласна ўкраінская кропка гледжання на «украінскае пытанне» і праграмныя патрабаванні нацыянальнага руху.

Першыя выданні, асабліва рэвалюцыйнага часу, змяшчалі ў сабе матэрыял не толькі нацыянальнага афарбавання, але і выразна палітычнага, у тым ліку апазіцыйнага, крытычнага ў дачыненні да ўраду, што стала, збольшага, прычынаю іх закрыцця. Акрамя асвятлення грамадска-палітычнага жыцця, перш за ўсё — дзейнасці першага ўсерасійскага парламенту, украінская перыёдыка змяшчала публіцыстычная тэксты, прысвечаныя рэальным вострым патрэбам украінскага грамадства. Найбольш часта сустракаюцца артыкулы, у якіх адстойваецца неабходнасць развіцця ўкраінскай мовы і школы, што заўсёды шло сумесна як два бакі адной праблемы — нізкага стану граматнасці і адукаванасці ўкраінскага селяніна, які з-за русіфікацыі сістэмы асветы быў адарваны ад адукацыі на роднай і зразумелай яму мове. Украінскія дзеячы выступалі не толькі за ўвядзенне нацыянальнай мовы ва ўстановах пачатковай адукацыі, але і за існаванне магчымасці навучання па-ўкраінску ў гімназіях, універсітэтах (агучвалася патрабаванне стварыць кафедры ўкраіназнаўства пры трох універсітэтах Маларосіі), настаўніцкіх семінарыях, інстытутах і інш. [3, с. 116]. Па гэтаму пытанню вялася найбольш жорсткая дыскусія ў грамадскім прасторы з прадстаўнікамі розных катэгорый актыўнай расійскай грамадскасці (КДП, рускія нацыяналісты і прапагандысты, урад і г. д.). Пры гэтым улада з вялікай упартасцю ставілася да ўвядзення «маларускай гаворкі» у сферу асветы, бо бачыла ў гэтым шлях да расколу рускай культуры (маецца на ўвазе тое, што нацыяналізацыя дадзенай сферы прывядзе да хуткага фарматавання ўкраінскай ідэнтычнасці сярод насельніцтва Маларосіі замест рускай, якую планавалася пабудаваць у рамках урадавай нацыянальнай палітыкі). У 1910 г. П. Сталыпін выдаў цыркуляр[2], які загадваў

[2] Ліст П. А. Сталыпіна да губернатараў ад 20 студзеня 1910 г.

рабіць перашкоды для стварэння іншародніцкіх культурна-асветніцкіх арганізацый, у тым ліку ўкраінскіх. Чальцы Кіеўскага клубу рускіх нацыяналістаў лічылі, што распрацаваная літаратурная форма ўкраінскай мовы «незразумела ні народу, ні інтэлігенцыі» [9, с. 69], і прыводзіць толькі да «падзенню асветы і паслабленню палітычнай магутнасці ўсяго народу» [2, с. 249–251].

Шмат увагі ўкраінскія дзеячы надавалі распаўсюджанню друку сярод сялянства, на якога накіроўваліся і асноўныя намаганні па экспарту нацыянальнай ідэнтычнасці. Самай паспяховай сярод сялянскіх выданняў была газета «Сяло», якая праіснавала 18 месяцаў пасля пачатку выдання ў 1909 г. і была заменена на іншы штотыднёвік «Засеў» (1911–1912). Апошні характарызаваўся меньшай увагаю да асвятлення палітычных падзей. У выданні гэтых газет прыймалі ўдзел галоўныя ўкраінскія публіцысты, у тым ліку М. Грушэўскі.

Украінскі друк стаў той сферай нацыянальнай справы, якая найбольш дынамічна і паспяхова развівалася ў перыяд з 1905 па 1914 г. Мы можам засведчыць, што «украінскае слова» не толькі прасочвалася да розумаў розных катэгорый насельніцтва, а таксама дало магчымасць заявіць аб існаванні нацыянальнага руху і яго патрэбах на «всеуслышание» расійскай супольнасці. Украінскія выданні падтрымлівалі сувязі з іншымі нацыянальнымі выданнямі Расіі, што давала магчымасць ствараць адзіны «інфармацыйны фронт» у нацыянальным дыскурсе імперыі. Шчыльнымі ў выдавецкай прасторы былі, як вядома, сувязі беларускай і ўкраінскай перыёдыкі. «Наша Ніва» пільна сачыла за нацыянальным рухам украінцаў, змяшчала ўкраінскія творы і артыкулы ўкраінскіх дзеячаў. Тое ж самае назіралася і ва ўкраінскіх выданнях. Публіцыстычная камунікацыя дзвух нацыянальных руслаў была «выклікана тыпалагічным падабенствам беларускага і ўкраінскага нацыянальных Адраджэнняў ды поспехамі апошняга» [6, с. 188–189].

Станаўленне ўкраінскай перыёдыкі адбывалася ў складаных умовах, якія былі выкліканы рознымі чыннікамі, найбольш моцнымі з якіх былі ўрадавыя перашкоды. Усе нацыянальныя выданні цярпелі ад недахопу матэрыяльных сродкаў існавання і былі нерэнтабельнымі з-за малой колькасці перадплатнікаў. Так, напрыклад, Ю. Сіры, адзін з украінскіх публіцыстаў, наракаў на тое, што штодзённік «Рада» меў усяго каля 2000 перадплатнікаў (і гэта лічылася яшчэ вялікай лічбаю), у той час як «варожыя ўкраінскаму руху і інтэрэсам украінскага народу маскоўскія газеты, якія выходзілі ва Ўкраіне, малі дзясяткі тысяч перадплатнікаў» [4, с. 6]. Фактычна, украінскія выданні маглі існаваць толькі за кошт дабраахвотных інвестыцый мецэнатаў украінскай нацыянальнай справы. Так,

Е. Чыкаленка (памешчык), адзін з самых актыўных паборнікаў нацыянальнага друку, аддаваў на сваё дзецішча (газета «Рада») большую частку сваіх прыбыткаў, у сваіх «Успамінах» і «Штодзённіку» перманентна скардзіўся на праблемы фінансавага дэфіцыту выдання і галасіў нават «знікнуць з украінскіх гарызонтаў» [8, с. 38], калі «Рада» прыпыніць сваю працу.

З аб’ектыўных сацыяльных прычын такога стану сучаснікі вылучалі адсутнасць на пачатку XX ст. сфармаванай спелай мэтавай аўдыторыі: «у той час на тэрыторыі Украіны прэса на ўкраінскай мове была вялікай рэдкасцю і не мела свайго сфарміраванага кола чытачоў. Вядома, што да таго часу ва Украіне не было нават народнай украінскай школы. Па-за таго маленькага гуртка украінцаў, якія ўмелі чытаць і пісаць па-ўкраінску, для шматмільённага насельніцтва расійскай Украіны з’яўленне ўкраінскай прэсы з новым правапісам і г. д. было чымсьці не толькі новым, але і незразумелым, што патрабавала вывучкі і навукі» [5, с. 32]. Праблема правапісу, якім мусіла друкаваць газеты і часопісы, паўстала даволі складанай не толькі для чытачоў, але і для выдаўцоў, якія вялі працяглыя спрэчкі вакол «стандартызацыі» мовы друку. Іншай праблемай выдавецкай дзейнасці быў недахоп прафесійных кадраў [4, с. 5].

Тым не меньш, без адміністрацыйных перашкод усе гэтыя «недарэчнасці» не мелі б такога прыгнятальнага стану. Негледзячы на заканадаўчы дазвол, урад рознымі шляхамі пры выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу, а часам — і звычайных паліцэйскіх мераў, — здзяйсняў абструкцыі для развіцця перыядычнага друку з украінскім ухілам. Е. Чыкаленка вызначыў галоўны шлях абмежаванняў, які заключаўся ў тым, што «мы, украінцы, дасягнулі скасавання закону 1876 г. і дасталі магчымасць выдаваць газеты на ўкраінскай мове, хаця, праўда, не дасягнулі магчымасці іх свабодна перадплачваць» [7, с. 407]. Адным з самых шкодных мерапрыемстваў улад было затрыманне экзэмпляраў выданняў на поштах. «Так, у маларасійскіх губернях нават дзейнічаў „сакрэтны“ цыркуляр па паштовым ведамстве, у якім гаварылася аб неабходнасці перашкаджаць трапленню левых газет у рукі сялян і які распаўсюджваўся і на ўсе ўкраінскія выданні».

Найбольш распаўсюджаным спосабам даўлення на выдавецтва служыла сістэма штрафаў, якая стварала непераадольныя фінансавыя бар’еры для ўкраінскага друку, які і без таго ледзь знаходзіў сродкі для існавання. Даходзіла нават да прамога адміністрацыйнага прыпынення выдаўніцтва, аднак на такі выпадак заўсёды падрыхтоўвалася «запасное» выданне (як, напрыклад, «Засеў», які быў фактычна працягам газеты «Сяло») [1, с. 30].

Насуперак адміністрацыйным перашкодам і неспрыяльным умовам фінансавання ўкраінскага перыядычнага друку на працягу 1905–1914 гг.

справа нацыянальнага выдаўніцтва не згасала. Колькасць газет і часопісаў расла, хаця не шмат з іх праіснавала больш года [1, с. 28]. Праблема фінансавага забеспячэння вырашалася праз ахвяраванні з боку «неабыякавых да ўкраінскай справы багачоў».

Нацыянальна арыентаваны друк выявіўся не безвыніковым сродкам распаўсюджання нацыянальнага самаўсведамлення сярод розных колаў насельніцва Украіны. Перш за ўсё, намаганні выдаўцоў былі накіраваны на інтэлігенцыю і «працоўны люд». Акрамя таго, актывізацыя публіцыстычнай палемікі падагравала ўсерасійскі грамадскі дыскурс па ўкраінскаму пытанню, а таксама прыцягвала ўвагу з боку замежных сіл, якія бачылі ва ўкраінскім рухе патэнцыйны інструмент даўлення на Расію ў кантэксце блізкай сусветнай вайны.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Гром О. А.* Национальная периодическая печать в Российской империи в 1905–1916 гг.: феномен и исследовательская перспектива // Новое прошлое / The New Past, 2022. № 4. С. 24–45.
2. *Кресіна І. О.* Українська національна свідомість і сучасні політичні процеси: (Етнополітологічний аналіз). К.: Вища шк., 1998.
3. *Русова С.* Современные школьные нужды на Украине // Украинский вестник. 1906. № 2. С. 115–122.
4. *Тищенко-Сірий Ю.* Перші наддніпрянські українські масові політичні газети. Нью-Йорк: Українсько-Американське Видавниче Товариство, 1952.
5. *Ткаченко І. В.* Видання українського народного тижневика «Засів» у Києві (1911–1912) // Рукописна та книжкова спадщина України. 2004. Вип. 9. С. 29–45.
6. *Унучак А. У.* Сувязь «Нашай Нівы» з украінскім нацыянальным Адраджэннем (пачатак XX ст.) // Беларусь — Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін. Мінск: Ін-т гісторыі, 2004. С. 187–190.
7. *Чикаленко Є.* Спогади (1861–1907). Нью-Йорк: Українська вільна академія наук у США, 1955.
8. *Чикаленко Є.* Щоденник (1907–1917). К.: Темпора, 2011.
9. *Щеголев С. Н.* Современное украинство. Его происхождение, рост и задачи. Киев: Типографія И. Н. Кушнерев и Ко, 1912.